# ГІСТОРЫЯ

УДК 930. 1(476)«1921/39»

***Аляксандр Аляксандравіч Савіч***
*канд. гіст. навук, дац., дэкан гістарычнага факультэта*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Aliaksandr Savich***
*Candidate of Historical Sciences, Associate Professor,*
*Dean of the Faculty of History of Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: uleks@tut.by

## ФАРМІРАВАННЕ І РЭПРЭЗЕНТАТЫЎНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ФОНДУ ПРАДСТАЎНІЦТВА ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў НАЦЫЯНАЛЬНЫМ АРХІВЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*На аснове архіўных дакументаў адлюстравана гісторыя стварэння Прадстаўніцтва Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ) пры ЦК КПБ(б) і фарміравання яго фонду ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, пададзены палітычныя фактары, якія ўплывалі на арганізацыйна-тэхнічнае забеспячэнне рэвалюцыйнага руху Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. і стварэнне ўстаноў па яго інфармацыйна-аналітычным забеспячэнні, адлюстраваны тэматычны дыяпазон адкладзеных у фондзе дакументальных крыніц, акрэслены рэпрэзентатыўныя магчымасці гэтага архіўнага масіва. Адзначана, што Прадстаўніцтва КПЗБ кантралявала спецыяльныя навуковыя ўстановы ў БССР па вывучэнні заходнебеларускага краю і было ключавой структурай па арганізацыі рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг., у выніку чаго быў створаны масіў крыніц, акумуляваных у фондзе 242п Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь як калекцыі змястоўных дакументаў, якія маюць вялікі рэпрэзентатыўны патэнцыял для даследавання гісторыі і гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг.*

***Ключавыя словы:*** *Заходняя Беларусь, рэвалюцыйны рух, Прадстаўніцтва Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, гістарыяграфія, крыніцазнаўства, архіўныя дакументы, рэпрэзентатыўнасць.*

## *Formation and Representative Potential of the Fund of the Representative Office of the Central Committee of the Communist Party of Western Belarus in the National Archives of the Republic of Belarus*

*Based on archival documents, the article reflects the history of the creation of the Representative Office of the Central Committee of the Communist Party of Western Belarus (KPZB) under the Central Committee of the CPB (B) and the formation of its fund in the National Archive of the Republic of Belarus (NARB), political factors affecting the organizational and technical support of the revolutionary movement of Western Belarus in 1921–1939 and the creation of institutions for its information and analytical Thus, the thematic range of documentary sources deposited in the fund is reflected, the representative possibilities of this archival array are outlined. It is noted that the KPZB representative office was a key structure for supporting the revolutionary liberation movement in Western Belarus in 1921–1939, controlled special scientific institutions of the BSSR for the study of the Western Belarusian territory, as a result of which an array of sources was created, which were accumulated in the 242p NARBA fund as a substantial collection of sources on the history and historiography of the history of Western Belarus in 1921–1939.*

***Key words:*** *Western Belarus, revolutionary movement, KPZB representation, historiography, source studies, archival documents, representativeness.*

### Уводзіны

Вызначальнай умовай развіцця гістарычных ведаў з'яўляецца паўнавартаснае функцыянаванне архіўнай справы, высокакваліфікаваная дзейнасць якой забяспечвае эмпірычную самадастатковасць гістарычнай навукі. Гэта адносіцца і да развіцця гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. Характэрнай асаблівасцю айчыннага архіваводства ў савецкія часы было імкненне забяспечыць надзейную ахову сакрэтаў самых разнастайных аспектаў гісторыі Беларусі, пільны кантроль над архіўна-пошукавымі намаганнямі айчынных гісторыкаў шляхам абмежавання доступу да непажаданай для партыйна-дзяржаўнай навукі

архіўнай інфармацыі. У выніку гэтага велізарныя масівы архіўных дакументаў знаходзіліся на сакрэтным захоўванні і не маглі стаць аб'ектам навуковага аналізу айчынных гісторыкаў. Не дзіўна, што, абцяжараная марксісцка-ленінскімі абмежавальнымі патрабаваннямі, айчынная гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі ў канцы савецкай эпохі апынулася ў крызісным стане, калі вялікая колькасць разнастайнай навуковай і навукова-папулярнай прадукцыі савецкіх часоў, з аднаго боку, стварала ўражанне пра добра вывучаную гісторыю Заходняй Беларусі, з другога – характарызавалася відавочнай тэндэнцыйнасцю, заідэалагізаванасцю, завуаляванасцю многіх пытанняў. Вядомае ажыўленне і ўдасканаленне гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі ў 1990–2000-я гг. адбылося дзякуючы ў тым ліку рассакрэчванню архіўных дакументаў і актыўнай архіўна-пошукавай дзейнасці беларускіх гісторыкаў з наступным увядзеннем у навуковы ўжытак дакументаў сакрэтнага захавання. Важную ролю ў гэтым адыгралі матэрыялы фонда 242п Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НА Рэспублікі Беларусь) «Прадстаўніцтва Цэнтральнага камітэта Кампартыі Заходняй Беларусі (ЦК КПЗБ)», якія ў значнай ступені забяспечылі эўрыстычны характар даследаванняў сучасных айчынных гісторыкаў [1, с. 40–42].

Мэтай артыкула з'яўляецца адлюстраванне гісторыі фарміравання і вызначэнне рэпрэзентатыўнасці фонду Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ як корпусу архіўных дакументаў па гісторыі і гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939-х гг.

**Асноўная частка**

Фарміраванне калекцыі крыніц, якія захоўваюцца ў фондзе 242п НАРБ, адбывалася ў выніку ажыццяўлення арганізацыйна-аналітычнай дзейнасці савецкіх ваенных і партыйна-дзяржаўных органаў, накіраванай на забеспячэнне свайго ўплыву на тэрыторыю і насельніцтва Заходняй Беларусі. Адпаведныя дзеянні павінны былі забяспечыць вызваленне беларускіх абшараў ад польскай акупацыі ў выніку рэвалюцыйнага руху ў краі, галоўнай сілай якога стала створаная ў канцы 1923 г. Камуністычная партыя Заходняй Беларусі як частка Кампартыі Польшчы (КПП).

Арганізацыйна-тэхнічныя захады па падтрымцы вызваленчай барацьбы патрабавалі кваліфікаванага навукова-аналітычнага асэнсавання тэматыкі Заходняй Беларусі і фарміравання дакументальнай базы, што падвяргалася ўважліваму ўліку і аналізу ў зацікаўленых савецкіх інстанцыях. Імі найперш былі дзяржаўныя і партыйныя ўстановы, якія курыравалі заходнебеларускую праблематыку і фарміравалі адпаведныя дакументальныя масівы па гісторыі Заходняй Беларусі пад уладай Польшчы міжваеннага перыяду. Сярод такіх было і Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ – ключавая структура, сапраўдны штаб рэвалюцыйнай барацьбы за пераадоленне негатыўных для Беларусі наступстваў несправядлівага Рыжскага міру.

Само Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ было арганізавана ў 1924 г. у выглядзе Бюро дапамогі Кампартыі Заходняй Беларусі пры ЦК КП(б)Б («Закардоннае бюро»). 16 ліпеня 1924 г. С. Скульскі ад імя Бюро ЦК КПП праінфармаваў І. Сталіна аб стварэнні ў Мінску пры ЦК КП(б)Б Бюро дапамогі КПЗБ для забеспячэння неабходнай падтрымкі дзейнасці створанай у канцы 1923 г. партыі [2, арк. 6]. Ужо 17 ліпеня 1924 г. адбылося першае пасяджэнне Бюро дапамогі ў складзе А. Чарвякова, У. Ігнатоўскага, Я. Адамовіча, Ляўковіча (І. Лагіновіча) і С. Скульскага (Мертэнса) [3, арк. 1]. Як бачым, у склад Бюро дапамогі КПЗБ увайшлі вышэйшыя партыйна-дзяржаўныя дзеячы БССР, у тым ліку У. Ігнатоўскі, які да кастрычніка 1924 г. кіраваў тэхнічнай работай і арганізоўваў выкананне рашэнняў бюро [4]. Асоба У. Ігнатоўскага і яго дзейнасць, датычная да Заходняй Беларусі, вельмі паказальныя імкненнем да кансалідацыі беларускіх палітычных і культурных дзеячаў пад сцягам нацыянальнага вызвалення краю з-пад польскай акупацыі.

Менавіта пад яго патранажам дзейнічаў М. Гурын-Маразоўскі, які стаў на чале беларускай нацыянальнай фракцыі ў КПЗБ – «сэцэсіі». М. Гурын-Маразоўскі і «сэцэсія», відавочна, са згоды У. Ігнатоўскага, выступалі супраць польскага дамінавання ў заходнебеларускім камуністычным руху, былі ініцыятарамі выпрацоўкі і прыняцця на II канферэнцыі КПЗБ у кастрычніку 1924 г. курсу на арганізацыйную і палітычную падрыхтоўку да ўзброенага паўстання для вызвалення Заходняй Беларусі з-пад улады

Польшчы і ўз'яднання яе з БССР. Супраць такога рашэння былі польскія камуністы, якія дамагліся асуджэння «сэцэсіі» з боку Выканкама Камінтэрна як раскольніцкай і падрыўной групоўкі. Наступствам гэтых падзей стала скасаванне ў сакавіку–лютым 1925 г. Бюро дапамогі КПЗБ. Паводле архіўных крыніц, Бюро дапамогі правяло сем пасяджэнняў (апошняе зафіксавана пратаколам без нумару ад 21 снежня 1924 г.) з адзіным пытаннем у парадку дня: «Слухалі: I. Інфармацыю аб II канферэнцыі КПЗБ і прынятых ёй рашэннях» [3, арк. 23].

На вялікі жаль, абмеркаванне на апошнім пасяджэнні Бюро гэтай прынцыпова важнай для заходнебеларускага нацыянальнавызваленчага руху праблемы не можа быць рэканструявана на падставе наяўных навуковых крыніц. Гэта тычыцца і ўцэлым дзейнасці Бюро дапамогі КПЗБ, у адрозненне ад прадстаўленага вялікай колькасцю разнастайных дакументальных крыніц Прадстаўніцтва КПЗБ. Пратаколы Бюро дапамогі, якія змяшчаюцца ў фондзе Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ, характарызуюцца адміністратыўна-бюракратычным мінімалізмам, адлюстроўваючы назыўным парадкам толькі агульныя напрамкі работы арганізацыі, не змяшчаюць канкрэтыкі ў выглядзе планаў, справаздач, фінансава-каштарысных і іншых вызначальных арганізацыйна-тэхнічных паказчыкаў [3]. Відавочна, у выніку скасавання Бюро дапамогі яго матэрыялы былі адлюстраваны і ў ходзе вымання найбольш важных дакументаў сакрэтнага канфідэнцыйнага характару трапілі ў пакуль нявысветленыя інстанцыі. Да таго ж матэрыялы, найбольш небяспечныя для саміх асоб, датычных да дзейнасці Бюро, былі імі знішчаны. Так, у час допыту У. Ігнатоўскі прызнаў, што «частку лістоў да М. Гурына-Маразоўскага, якія былі не на карысць мне, я знішчыў» [5, с. 185–186].

Замест Бюро дапамогі было створана Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б, якое працавала пад кіраўніцтвам Прадстаўніцтва КПП пры Выканкаме Камінтэрна ў Маскве і лічылася яго філіялам у Мінску [6]. Гэта азначала, што польскія камуністы, ліквідаваўшы «сэцэсію», змаглі пазбавіцца вырашальнай ролі камуністаў-беларусаў у камуністычным руху Заходняй Беларусі, навязаць КПЗБ свой кантроль, выводзячы яе з-пад уплыву КП(б)Б, кіраўніцтва якой дэманстравала сваю незадаволенасць і патрабавала ад кіраўніцтва КПП своечасовага інфармавання па пытаннях палітычнай работы ў Заходняй Беларусі [7, арк. 15, 18, 28].

Вядома, што Прадстаўніцтва КПЗБ пры ЦК КП(б)Б непасрэдна кіравала школай і Замежнай рэдакцыяй КПЗБ; пад яго кантролем ажыццяўлялі дзейнасць Камісія па вывучэнні Заходняй Беларусі (КВЗБ) і Заходні сектар Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б (ЗС) [8, с. 91].

Ветэран КПЗБ, польская даследчыца А. Бергман сцвярджала, што Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ з'яўлялася падраздзяленнем ДПУ-НКУС [9]. Гэтая інфармацыя верыфікуецца заявай М. Арэхвы, члена цэнтральнага кіраўніцтва КПЗБ, у Камітэт партыйнага кантролю пры ЦК КПСС ад 13 сакавіка 1958 г., паводле якой у Мінску да 1937 г. знаходзіліся ўстановы, звязаныя з працай КПЗБ: Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ, школа і Замежная рэдакцыя КПЗБ, Камісія па вывучэнні Заходняй Беларусі і Заходні сектар Інстытута гісторыі партыі, якія «існавалі з ведама і пры поўнай падтрымцы кіраўніцтва Камінтэрна, ЦК КПБ і органаў тагачаснага НКУС. У гэтых установах знаходзілася шмат кіруючых работнікаў КПЗБ» [10, арк. 72].

Названыя арганізацыі працавалі ва ўмовах строгай канспірацыі, мелі свой дакументазварот і насычанне крыніцамі сакрэтнага захавання, у тым ліку дакументамі Прадстаўнітва ЦК КПЗБ. І, наадварот, частка дакументазвароту (падкантрольных Прадстаўніцтву структур) у выглядзе арыгіналаў і копій дакументаў апынулася ў архіве Прадстаўніцтва і пазней у фондзе 242п НАРБ. Пацвярджэннем сакрэтнасці названых устаноў з'яўляецца інфармацыя «аб выкананні строгай канспірацыі» ў Заходнім сектары і непажаданасці вядзення пратаколаў яго пасяджэнняў [11, арк. 13, 19]. Красамоўным з'яўляецца і выказванне дырэктара Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б С. Поссе аб асаблівым становішчы, закрытасці і двайным падпарадкаванні ЗС: як навуковай структуры – Інстытуту гісторыі партыі, а па сакрэтнай лініі адначасова, відавочна, Прадстаўніцтву КПЗБ, а праз яго – органам НКУС» [12, арк. 1].

Першапачаткова галоўнымі суб'ектамі разгортвання рэвалюцыйнай барацьбы ў краі былі савецкія ваенна-палітычныя і разведвальныя структуры, у першую чаргу

Разведвальнае ўпраўленне 16 Арміі, а пазней Заходняга фронту і Беларускай ваеннай акругі. Яны займаліся зборам і аналізам разнастайнай інфармацыі аб Заходняй Беларусі і польска-савецкім памежжы як тэрыторыі, на якой адбывалася адкрытае ваеннае і патаемна-канспіратыўнае супрацьстаянне польскіх і савецкіх спецслужбаў, дзейнічалі агентурна-разведвальныя сеткі і дыверсійныя групы, фарміравалася камуністычнае падполле. Гэта, у сваю чаргу, выклікала з'яўленне і назапашванне масіва розных дакументаў, у тым ліку афіцыйнага ліставання, пастаноў, справаздач, данясенняў, тлумачальных запісак, асабістых спраў, лісткоў уліку кадраў, характарыстык, біяграфій і іншых эга-дакументальных крыніц, якія змяшчае фонд 242п.

Паказальным з'яўляецца тое, што ў фондзе, названым па ўзніклай толькі ў пачатку 1925 г. структуры – Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б, – захоўваюцца дакументы больш ранняга паходжання, нават 1919 г., якія былі створаны, у прыватнасці, у Бюро нелегальнай работы і Сакрэтным аддзеле пры Цэнтральным бюро КП(б)Б. Гэтыя інстанцыі арганізоўвалі і курыравалі нелегальную работу ў Заходняй Беларусі, падтрымліваючы сувязі як з падкантрольнымі ячэйкамі ў краі, так і з партыйна-дзяржаўнымі органамі на тэрыторыі БССР і СССР (ЦК УКП(б), ЦК КПП, ЦК КП Літвы і Беларусі, Народным камісарыятам замежных спраў БССР, Палітупраўленнем Заходняга фронту, асобымі аддзеламі памежных частак і інш.).

З цягам часу адпаведныя матэрыялы траплялі ў Прадстаўніцтва КПЗБ, бягучы архіў якога папаўняўся шматлікімі дакументамі ў выглядзе рэзалюцый, пастаноў, справаздач, пратаколаў, улётак, фінансава-каштарыснай дакументацыі і інш., якія адлюстроўваюць тэорыю і практыку арганізацыі і забеспячэння камуністычнага руху ў Заходняй Беларусі.

Савецкія ўстановы, якія адказвалі за ваенна-палітычныя аспекты ўзаемаадносін з Польшчай, функцыянавалі па лініі ваеннай разведкі, ДПУ ці камінтэрнаўскай «закардоннай справы», ажыццяўлялі аналіз наяўнай інфармацыі і фарміравалі масівы крыніц у выглядзе даведачна-аналітычных матэрыялаў па заходнебеларускай праблематыцы [13–15]. Для належнай падтрымкі рэвалюцыйнага падполля ў Заходняй Беларусі патрабавалася інфармацыя ад арганізатараў і ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў краі – функцыянераў КПЗБ. Ад іх у Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ, як галоўны штаб рэвалюцыйнай барацьбы ў Заходняй Беларусі, паступалі і адкладваліся ў яго бягучым архіве разнастайныя звесткі ў выглядзе стэнаграм, пратаколаў, рашэнняў з'ездаў і канферэнцый КПЗБ, справаздач і паведамленняў аб становішчы ў Польшчы і Заходняй Беларусі, арганізацыйна-тэхнічным забеспячэнні, фінансаванні, кадравых пытаннях і стане працы партыйных і камсамольскіх арганізацый, аб палітычных кампаніях і кіраўніцтве нацыянальна-вызваленчым і забастовачным рухам, працы ў вёсцы, матэрыялы па арганізацыі ўзаемадзеяння з беларускімі палітычнымі і культурнымі арганізацыямі і дзеячамі. Фонд змяшчае вялікую колькасць лістоў, адозваў, улётак, матэрыялаў разнастайных перыядычных выданняў, бюлетэняў, успамінаў і інш. Атрыманая інфармацыя з Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ ішла ў КВЗБ і ЗС, дзе падвяргалася навукова-аналітычнай апрацоўцы з наступным прадстаўленнем засакрэчаных звестак ў розныя ваенна-палітычныя інстанцыі. Палітычная абумоўленасць, карпаратыўная і асабістая зацікаўленасць аўтараў крыніц, а часта і крыптаграфічныя акалічнасці адпаведнага гістарыяграфія, патрабуюць належнай верыфікацыі дакументаў фонда.

Надзвычай запатрабаванай для супрацоўнікаў Прадстаўніцтва была інфармацыя аб рэальным стане эканомікі і грамадства ў краі, крыніцамі якой павінны былі стаць і польскія дакументы, у тым ліку матэрыялы польскіх усеагульных перапісаў, Галоўнага статыстычнага ўпраўлення, Прамыслова-гандлёвай палаты, Статыстыкі прамысловасці, Статыстыкі працы, Статыстычных штогоднікаў, Прамысловых і гандлёвых даведнікаў, справаздач інспекцыі працы, ваяводскіх дзённікаў і інш. На падставе іх супрацоўнікі Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ і падкантрольных яму навуковых устаноў ажыццяўлялі навукова-аналітычную работу, дэманструючы высокі ўзровень распрацоўкі стану Заходняй Беларусі, праведзены з выкарыстаннем разнастайных дакументальных крыніц і даследаванняў, якія ў тэарэтычным плане дапасоўваліся да задач рэва-

люцыйнай барацьбы і ваенна-палітычных патрэб савецкай улады.

Намаганнямі даследчыкаў 1920-х – пачатку 1930-х гг., супрацоўнікаў КВЗБ, Заходняга сектара і іншых навуковых структур была створана вялікая колькасць прадукцыі навукова-даследчыцкага характару ў выглядзе даведак, аналітычных запісак, абагульняльных матэрыялаў да пасяджэнняў розных партыйных і дзяржаўных органаў БССР, КПБ, КПЗБ і КПП. Некаторыя з іх уяўляюць сабой ёмістыя даведнікі з інфармацыяй пра тэрыторыю і насельніцтва Заходняй Беларусі, сацыяльна-эканамічныя, грамадска-палітычныя, канфесійныя асаблівасці краю. Такога кшталту даследаванні ўяўляюць сабой своеасаблівыя абагульняльныя працы па гісторыі Заходняй Беларусі, адлюстроўваюць высокі ўзровень распрацоўкі заходнебеларускай праблематыкі, праведзены з выкарыстаннем разнастайных дакументальных крыніц [16–18]. Гэтыя матэрыялы былі каштоўнай крыніцай для выпрацоўкі і карэкціроўкі камінтэрнаўскім кіраўніцтвам курсу палітычных кампаній у Заходняй Беларусі, а адпаведная аб’ектыўна-навуковая інфармацыя была важкім аргументам нацыянальна арыентаваных дзеячаў КП(б)Б і КПЗБ у адстойванні імі беларускіх прыярытэтаў, у тым ліку пры вызначэнні плошчы тэрыторыі Заходняй Беларусі ў канкурэнцыі за яе з кіраўніцтвам кампартый Польшчы і Літвы [19].

Натуральнай рысай фарміравання дакументальнай базы Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ быў яго дакументаабмен як з падкантрольнымі арганізацыямі, так і з кіруючымі інстанцыямі, сярод якіх Камінтэрн і яго структуры, ЦК КП(б)Б, ЦК КПП, савецкія дзяржаўна-палітычныя органы і інш. Вядома, што адначасова з арганізацыйнай работай у краі падкантрольных Камінтэрну кампартый Беларусі, Польшчы і Літвы па стварэнні камуністычнага падполля паміж імі ішла канкурэнтная барацьба за кантроль над Заходняй Беларуссю, яе тэрыторыяй, за ўплыў сярод мясцовага насельніцтва. Водгукі барацьбы атрымалі сваё ўвасабленне ў адпаведным дакументазвароце, найперш у выглядзе справаздач з заходнебеларускіх абшараў ад прадстаўнікоў савецкай рэзідэнтуры, падпарадкаванай ваенна-палітычнаму кіраўніцтву БССР [20; 21]. Наступствамі гэтай канкурэнцыі ў гісторыі КПЗБ стала працяглая фракцыйная барацьба, якая атрымала адлюстраванне ў крыніцах фонда [22; 23].

Высокі ўзровень сакрэтнасці Прадстаўніцтва КПЗБ і падкантрольных яму КВЗБ, ЗС і Замежнай рэдакцыі КПЗБ ствараў дадатковыя складанасці забеспячэння крыніц. У прыватнасці, супрацоўнікі ЗС нават у пачатку 1930-х гг. мелі праблемы з наяўнасцю і польскіх, і савецкіх выданняў, звярталіся ў Музей Рэвалюцыі СССР, КУНМЗ, 1-ю публічную бібліятэку СССР імя У. Леніна, Інстытут Маркса – Энгельса – Леніна, Польсекцыю Камінтэрна, у рэдакцыі савецкіх цэнтральных газет і часопісаў з просьбай перасылкі іх выданняў і матэрыялаў па гісторыі Польшчы, Заходняй Беларусі, КПП, КПЗБ на беларускай, рускай, яўрэйскай і польскай мовах [24, арк. 12, 13]. Пацвярджэннем абмежаваных магчымасцей крыніц для навукова-аналітычнай працы на карысць рэвалюцыйнага руху Заходняй Беларусі стала сутычка паміж Прадстаўніцтвам КПП пры Выканкаме Камінтэрна і падпарадкаваным яму Прадстаўніцтвам ЦК КПЗБ пры КП(б)Б па пытаннях несвоечасовай перасылкі інфармацыйных матэрыялаў [7, арк. 15, 18, 21–23].

Набыццё і дастаўка з Польшчы і Заходняй Беларусі ў Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ матэрыялаў польскай перыёдыкі і афіцыйнай статыстыкі, навуковых, папулярных і дакументальных выданняў суправаджалася арганізацыйна-тэхнічнымі праблемамі, у тым ліку і па дыпламатычных каналах. Так, А. Загорнаў, дарадца савецкага пасольства ў Варшаве і адзін з куратараў беларускага руху ў Польшы, у 1926 г. скардзіўся ў Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ на свайго кіраўніка, савецкага пасла П. Войкава, што той прыдзіраўся да А. Загорнава за вялікі аб’ём дыпламатычнай пошты [25, арк. 20].

Адносна дакументальнай ёмістасці самога ЦК Прадстаўніцтва КПЗБ разважаць можна толькі гіпатэтычна і ўскосна, у прыватнасці, на падставе звестак пра архіў Заходняга сектара, які ў сярэдзіне 1930-х гг. налічваў 328 папак [11, арк. 47–163]. Гэта была невялікая рэшта, бо ў 1936 г. 597 спраў былі перададзены Польскай секцыі і Прадстаўніцтву КПП Выканкама Камінтэрна, а 599 былі здадзены ў партархіў ЦК КП(б)Б [26, с. 120]. Ды і пасля гэтага ў названыя структуры і ў іншыя савецкія ўстановы па

«беларускіх нацдэмах» і «польскай справе», па спісах і адзінкамі, быў перададзены вялікі масіў дакументаў, найперш асабістых спраў дзеячаў КПЗБ [27].

Такім чынам, на працэс фарміравання дакументальнага масіва Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ істотна ўплывалі як унутраныя арганізацыйныя патрэбы ўстановы, так і палітычныя кампаніі ў савецкай краіне, УКП(б), КП(б)Б, КПП, КПЗБ, шматлікія праверкі і чысткі, асабліва ў час палітычных рэпрэсій 1920–1930-х гг., у тым ліку ў ходзе падрыхтоўкі роспуску КПЗБ і яго ажыццяўлення ў другой палове 1930-х гг. Такія падзеі актуалізавалі дакументальнае пацвярджэнне ці абвяржэнне адпаведнай інфармацыі аб аб’ектах праверак, што садзейнічала «вымыванню» дакументаў з установы і перасылцы іх у партыйна-дзяржаўныя, а ў наступным – следча-карныя інстанцыі БССР і СССР.

Верагодна, пасля роспуску КПЗБ дакументы Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ былі размешчаны ў партархіве Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б, дзе і знаходзіліся да Вялікай Айчыннай вайны, вірлівыя падзеі якой відавочна аказалі моцнае ўздзеянне на колькасць дакументаў і змястоўнасць фонду. Выкажам меркаванне, што асноўны масіў крыніц Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ быў эвакуіраваны ў канцы чэрвеня 1941 г., ім павінны былі карыстацца ў гады Вялікай Айчыннай вайны для арганізацыі антыфашысцкага падполля на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі. Так, В. Харужая ў сваіх лістах да М. Арэхвы ў сакавікукрасавіку 1942 г., знаходзячыся ў Маскве, цікавілася месцам былых «КПЗБістаў», якія «спатрэ-бяцца хутка» [28, арк. 15–16]. Найбольш запатрабаваныя з гэтага пункту гледжання дакументы перайшлі ў адпаведныя структуры Чырвонай Арміі, НКУС, МДБ, а астатак матэрыялаў Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ і падкантрольных яму структур быў накіраваны ў архіў Інстытута Маркса – Энгельса – Леніна ў Маскве.

У цэлым, неспрыяльная палітычная сітуацыя ў 1930-х – пачатку 1950-х гг. у краіне істотна запаволіла навукова-даследчыцкі працэс па вывучэнні гісторыі Заходняй Беларусі, архіўныя крыніцы прадстаўніцтва не маглі быць уведзены ў навуковы ўжытак з-за іх сакрэтнасці і табу на саму гісторыю КПЗБ. Дакументы Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ і звязаных з ім арганізацый сталі запатрабаванымі пасля смерці І. Сталіна. У 1955 г. у ходзе падрыхтоўкі да XX з’езда КПСС выявілася адсутнасць звестак па гісторыі КПЗБ, да рэабілітацыі якой рыхтавалася савецкае кіраўніцтва. Для выпраўлення сітуацыі ў БССР па лініі ЦК КПБ пачаўся збор інфармацыі пра КПЗБ: звярталіся да яе ветэранаў з просьбай прадстаўлення звестак пра іх партыйнае мінулае, дзейнасць КПЗБ і яе дзеячаў [29, арк. 7–23].

Пасля XX з’езду для навукова-гістарычнай рэабілітацыі КПЗБ пачалася актыўная архіўна-пошукавая дзейнасць у архівах Беларусі і за яе межамі (з далучэннем да збору матэрыялаў супрацоўнікаў партархіва Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ). Было прынята рашэнне звярнуцца да кіраўніцтва КПБ з прозьбай аб вяртанні матэрыялаў з камінтэрнаўскага фонду, найперш дакументаў, перададзеных у 1936 г. [10, арк. 28–36]. Па стане на 10 лістапада 1956 г. фонд 495 Архіва Камінтэрна меў вопіс 129 «Компартия Западной Белоруссии. 1921–1938 гг.» (709 спраў). Паводле вопісу ад 23 жніўня 1961 г. 631 справа была перададзена ў Беларускі філіял Інстытута Маркса – Энгельса – Леніна (Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ). У выніку рэарганізацыі беларускай архіўнай справы ў перыяд Рэспублікі Беларусь гэтыя дакументы былі пераведзены ў НАРБ і склалі яго сучасны фонд 242п.

Цяпер фонд Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ складаюць тры вопісы: у першым на захоўванні знаходзіцца 601 архіўная справа, у другім – 667, у трэцім – 28. З іх выразна вылучаецца тэматычны дыяпазон вопісу 3, які змяшчае асабістыя справы і ўліковыя карткі членаў КПЗБ. Малую колькасць спраў у вопісе 3 (з улікам гістарыяграфічнага факта пра колькасць членаў КПЗБ у 8 тыс. чалавек [10, арк. 79]) можна патлумачыць шматлікімі маніпуляцыямі з такога роду матэрыяламі як у 1920–1930-я гг., так і ў пасляваенны час, у тым ліку ў ходзе рэабілітацыі ахвяр сталінскіх рэпрэсій. Азначанае актуалізуе прадметнае вывучэнне фактара асобы ў нацыянальна-вызваленчай барацьбе ў Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гады ў рэчышчы даследавання арганізацыі і функцыянавання рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, КПЗБ і яе Прадстаўніцтва

пры ЦК КП(б), гісторыя якога заслугоўвае манаграфічнага навуковага асэнсавання.

**Заключэнне**

Фарміраванне фонду 242п «Прадстаўніцтва Кампартыі Заходняй Беларусі пры ЦК КП(б)Б» НАРБ адбывалася на працягу вялікага адрэзку часу. У 1920-я – першай палове 1930-х гг. у перыяд станаўлення і развіцця рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі адбывалася актыўнае назапашванне разнастайных дакументаў і матэрыялаў прадстаўніцтва, пасля якога да сярэдзіны 1950-х гг. назіралася дэзынтэграцыя матэрыялаў установы ў выніку дэструктыўнага ўздзеяння на яе дакументальнае напаўненне з боку савецкіх партыйна-дзяржаўных структур у ходзе палітычных рэпрэсій у дачыненні да дзеячаў КПЗБ і ў ходзе Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага скептычна-падазронага стаўлення да партыі і яе гісторыі. Пасля рэабілітацыі КПЗБ на XX з'ездзе КПСС пачалася рэінтэграцыя яго дакументальнай спадчыны ў архіве Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ. У выніку абуджэння цікавасці да гісторыі КПЗБ у абмежаваным аб'ёме сталі выкарыстоўвацца дакументы яе былога прадстаўніцтва пры ЦК КП(б)Б. У ходзе рэарганізацыі беларускай архіўнай справы ў перыяд Рэспублікі Беларусь корпус дакументаў Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ быў пераведзены ў НАРБ і склаў яго сучасны фонд 242п, рассакрэчванне матэрыялаў якога стала важкай падставай для аб'ектывізацыі гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг.

Фонд мае багаты рэпрэзентатыўны патэнцыял як база крыніц па гісторыі і гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі 1920–1930-х гг. Гэты крыніцавы масіў прыцягвае ўвагу наяўнасцю дакументаў савецкіх партыйна-дзяржаўных органаў і падпарадкаваных Выканкаму Камінтэрна палітычных структур, якія адлюстроўваюць грамадска-палітычныя, эканамічныя і культурныя аспекты гісторыі Заходняй Беларусі, у першую чаргу арганізацыю рэвалюцыйнага крыла беларускага нацыянальна-вызваленчага руху на чале з КПЗБ. У яго складзе разам з дакументамі па асноўных напрамках дзейнасці КПЗБ і Прадстаўніцтва захавана перыёдыка БССР, Заходняй Беларусі і замежных выданняў 1920–1930-х гг., разнастайныя звесткі па заходнебеларускай тэматыцы, найперш польская статыстыка. Матэрыялы Прадстаўніцтва КПЗБ і падкантрольных яму навуковых устаноў паказваюць высокі ўзровень распрацоўкі стану Заходняй Беларусі, праведзены з выкарыстаннем разнастайных дакументальных крыніц.

Адкладзены ў фондзе масіў змястоўных інфармацыйна-аналітычных даведнікаў, артыкулаў, нататак адлюстроўвае навукова-даследчыцкі працэс па вывучэнні заходнебеларускай рэчаіснасці ў падкантрольных Прадстаўніцтву КПЗБ навуковых установах, выяўляе прыярытэты і падыходы савецкага дзяржаўна-партыйнага кіраўніцтва да асэнсавання і адлюстравання ў друку гісторыі Заходняй Беларусі ў складзе міжваеннай Польшчы.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Савіч, А. А. Айчынная гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў : манаграфія / А. А. Савіч ; навук. рэд. А. А. Каваленя ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2019. – 300 с.

2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 32.

3. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 33.

4. Ладысеў, У. Бюро дапамогі Кампартыі Заходняй Беларусі пры ЦК КП(б)Б / У. Ладысеў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск : БелЭн, 1994. – Т. 2. – С. 154.

5. Академик, В. М. Игнатовский : документы и материалы / сост.: В. В. Скалабан, Н. В. Токарев ; редкол.: А. А. Коваленя (пред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2010. – 277 с.

6. Ладысеў, У. Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б / У. Ладысеў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск : БелЭн, 1999. – Т. 5. – С. 559–560.

7. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 80.

8. Наливайко, Г. И. Братская помощь и поддержка КП(б)Б Компартии Западной Белоруссии / Г. И. Наливайко // В авангарде революционной борьбы : материалы науч.-теорет.

конф., посвящ. 50-летию образования КПЗБ и КСМЗБ, Мінск, 29 нояб. 1973 г. – Минск : Беларусь, 1974. – С. 87–95.
9. Бергман, А. Нас вучыць гісторыя / А. Бергман // ЛіМ. – 1990. – 2 лют. – С. 12.
10. НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 1116.
11. НАРБ. – Ф. 60п. Воп. 1. Спр. 85.
12. НАРБ. – Ф. 60п. Воп. 1. Спр. 251.
13. НАРБ. – Ф. 60п. Воп. 3. Спр. 576.
14. НАРБ. – Ф. 60п. Воп. 3. Спр. 582.
15. НАРБ. – Ф. 60п. Воп. 3. Спр. 660.
16. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 66.
17. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 1. Спр. 7.
18. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 164.
19. Савіч, А. А. Ідэйна-палітычныя аспекты вызначэння плошчы Заходняй Беларусі айчыннымі даследчыкамі 1920–1930-х гадоў / А. А. Савіч // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2021. – № 2. – С. 18–24.
20. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 11.
21. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 12.
22. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 132.
23. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 133.
24. НАРБ. – Ф. 60п. Воп. 1. Спр. 86.
25. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 80.
26. Вахтомаў, Г. В. Станаўленне гістарыяграфіі рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі / Г. В. Вахтомаў, У. М. Міхнюк // Вес. АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1988. – № 5. – С. 118–125.
27. Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 1100.
28. НАРБ. –Ф. 976. Воп. 1. Спр. 55.
29. НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 1100.

## REFERENCES

1. Savich, A. A. Ajchynnaja histaryjahrafija historyi Zakhodniaj Bielarusi 1921–1939 hadou : manahrafija / A. A. Savich ; navuk. red. A. A. Kavalienia ; M-va adukacyi Resp. Bielarus, Bresc. dzjarzh. un-t imia A. S. Pushkina. – Brest : BrDU imia A. S. Pushkina, 2019. – 300 s.
2. Nacyjanal'ny arkhiu Respubliki Bielarus' (NARB). – F. 242p. Vop. 2. Spr. 32.
3. NARB. – F. 242p. Vop. 2. Spr. 33.
4. Ladysieu, U. Biuro dapamohi Kampartji Zakhodniaj Bielarusi pry CK KP(b)B / U. Ladysieu // Encyklapiedyja history Bielarusi : u 6 t. – Minsk : BielEn, 1994. – T. 2. – S. 154.
5. Akadiemik V. M. Ignatovskij : dokumienty i matierialy / sost.: V. V. Skalaban, N. V. Tokariev ; riedkol.: A. A. Kovalienia (pried.) [i dr.]. – Minsk : Bielarus. navuka, 2010. – 277 s.
6. Ladysieu, U. Pradstaunictva CK KPZB pry CK KP(b)B / U. Ladysieu // Encyklapiedyja history Bielarusi : u 6 t. – Minsk : BielEn, 1999. – T. 5. – S. 559–560.
7. NARB. – F. 242p. Vop. 2. Spr. 80.
8. Nalivajko, G. I. Bratskaja pomoshch i poddierzhka KP(b)B Kompartii Zapadnoj Bielorussii / G. I. Nalivajko // V avangardie rievoliucionnoj bor'by : matierialy nauch.-tieoriet. konf., posviashch. 50-lietiju obrazovanija KPZB i KSMZB, Vinsk, 29 nojab. 1973 g. – Minsk : Bielarus', 1974. – S. 87–95.
9. Biergman, A. Nas vuchyc' historyja / A. Biergman // LiM. – 1990. – 2 liut. – S. 12.
10. NARB. – F. 1440. Vop. 3. Spr. 1116.
11. NARB. – F. 60p. Vop. 1. Spr. 85.
12. NARB. – F. 60p. Vop. 1. Spr. 251.
13. NARB. – F. 60p. Vop. 3. Spr. 576.
14. NARB. – F. 60p. Vop. 3. Spr. 582.
15. NARB. – F. 60p. Vop. 3. Spr. 660.
16. NARB. – F. 242p. Vop. 2. Spr. 66.
17. NARB. – F. 242p. Vop. 1. Spr. 7.

18. NARB. – F. 242p. Vop. 2. Spr. 164.

19. Savich, A. A. Idejna-palitychnyja aspiekty vyznachennia ploshchy Zahodniaj Bielarusi ajchynnymi dasliedchykami 1920–1930-h hadou / A. A. Savich // Viesn. Bresc. u-ta. Sier. 2, Historyja. Ekanomika. Prava. – 2021. – № 2. – S. 18–24.

20. NARB. – F. 242p. Vop. 2. Spr. 11.

21. NARB. – F. 242p. Vop. 2. Spr. 12.

22. NARB. – F. 242p. Vop. 2. Spr. 132.

23. NARB. – F. 242p. Vop. 2. Spr. 133.

24. NARB. – F. 60p. Vop. 1. Spr. 86.

25. NARB. – F. 242p. Vop. 2. Spr. 80.

26. Vakhtomau, G. V. Stanauliennie histaryjahrafii revaliucyjnaha ruhu u Zakhodniaj Bielarusi / G. V. Vakhtomau, U. M. Mikhniuk // Vies. AN BSSR. Sier. hramad. navuk. – 1988. – № 5. – S. 118–125.

27. Rasijski dziarzhauny arkhiu sacyjal’na-palitychnaj historyi. – F. 1440. Vop. 3. Spr. 1100.

28. NARB. – F. 976. Vop. 1. Spr. 55.

29. NARB. – F. 1440. Vop. 3. Spr. 1100.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 08.08.2023*